Essener Trauma-Inventar (ETI)
Tagay S., Stoelk B., Möllering A., Erim Y., Senf W., 2007 ©

# Эсэнскі Траўма-Інвентар (ЭТІ)

## Вобласць прымянення:

Эсэнскі Траўма-Інвентар (ЭТІ) (Tagay, Erim, Stoelk, Möllering, Mewes, Senf 2007) для дарослых з’яўляецца анкетай для самастойнай адзнакі псіхатраўміруючых падзей і посттраўматычных ўскладненняў. ЭТІ дазваляе дыягнаставаць як посттраўматычнае стрэсавае расстройства (ПТСР), так і вострае стрэсавае расстройства (ВСР) згодна з крытэрамі дыягнаставання DSM-IV. Разам з катэгорыяльнай дыягностыкай абодва інструменты вымяраюць таксама ўзровень цяжкасці траўматычнай сімптаматыкі. К таму ж інструмент з рознай шкалой значэнняў дазваляе праводзіць эканамічны скрынінг для выяўлення людзей, якім патрэбна клінічнае назіранне. Апытальнік можа быць прыменены да ўсіх груп насельніцтва, перш за ўсё да людзей, якія перажываюць альбо перажылі вельмі цяжкае здарэнне ў жыцці (напрыклад, прыродную катастрофу, згвалтаванне, катаванне і г.д.). Інструмент складаецца з 58 пунктаў, вылучаных для ПТСР і ВСР наўпрост з крытэраў DSM-IV (Амерыканская псіхіатрычная Асацыяцыя, 1994).

## Пабудова і апісанне

ЭТІ складаецца з пяці частак:

У першай частцы прыведзены спіс траўм з 14 магчымымі здарэннямі. Пацярпеўшая асоба адказвае на пытанне, ці прыходзілася ёй перажываць пэўнае патэнцыйна траўматычнае здарэнне «асабіста» альбо ў якасці «назіральніка».

У другой частцы дадзена храналогія «самага кепскага здарэння». Наступныя пункты, якія характарызуюць самае кепскае здарэнне, ахопліваюць *крытэрый А1* (пагроза фізічнай цэласнасці) і А2 (суб’ектыўная адзнака страху, жаху альбо бездапаможнасці) згодна з DSM-IV. К таму ж 23 пункты выяўляюць актуальную посттраўматычную сімптаматыку. Частотнасць праявы вымяраецца па чатырохступеністай шкале Лікерта са значэннямі: 0 = «зусім не», 1 = «рэдка», 2 = «часта» і 3 = «вельмі часта». Гэтыя значэнні прымяняльныя для ПТСР па тром сімптомным кластэрам: Інтрузія (*В-крытэрый*; 5 пунктаў), Пазбяганне (*С-крытэрый*; 7 пунктаў), Павышаная ўзбудлівасць (*D-крытэрый*; 5 пунктаў). Апытанне крытэраў стрэсара, узятых з DSM-IV, дазваляе ў камбінацыі з усталяванымі значэннямі правесці скрынінг у дачыненні наяўнага ПТСР альбо ВСР. Калі абодва крытэрыі стрэсара (А1 & А2) выкананы і сума значэнняў у падзелах паўторнага перажывання падзеі, пазбягання і павышанай узбудлівасці дасягае 27 пунктаў альбо перавышае гэтую лічбу, - гэта сведчыць аб наяўнасці ПТСР. Значэнне ад 0 да 15 можна характарызаваць як нязначнае. Значэнні ад 16 да 26 з’яўляюцца лімітнымі і выклікаюць падазрэнне ў частковым ПТСР. Акрамя гэтага, ЭТІ даследуе дысацыятыўную сімптаматыку, бо яна з’яўляецца важнай для дыягназа вострага стрэсавага расстройства (пры ВСР: В-крытэрый; 6 пунктаў). Указаннем на наяўнае ВСР з’яўляецца агульнае мінімальнае значэнне 35, атрыманае з падзелаў Інтрузіі, Пазбягання, Павышанай узбудлівасці і Дысацыяцыі. У дадатак да сімптомных кластэраў ПТСР і ВСР кожны наступны пункт ахоплівае саматычныя недамаганні, якія ўпершыню з’явіліся пасля самага кепскага здарэння. Таксама адлюстраваны два пытанні па храналогіі сімптомаў (*крытэрый Е*).

Далей па шасціступеністай шкале Лікерта ацэньваецца, наколькі цяжка адбытая падзея перажываецца ў цяперашні час. Пятая частка ўключае ў сябе шэсць пунктаў, якія ахопліваюць сімптаматычна абумоўленыя абмежаванні ў паўсядзённым жыцці (*крытэрый F*).

Essener Trauma-Inventar (ETI)
Tagay S., Stoelk B., Möllering A., Erim Y., Senf W., 2007 ©

## Крытэрыі тэсціравання

У цягу свайго развіцця ЭТІ быў выкарыстаны ў мностве эксперыментаў з клінічнымі і неклінічнымі папуляцыямі. Выбарачная праверка 952 псіхічна і фізічна хворых, а таксама здаровых удзельнікаў эксперыментаў дала добрыя і вельмі добрыя вынікі. У розных даследаваннях ЭТІ ўжо зарэкамендаваў сябе як эфектыўны і надзейны інструмент, пераведзены на 11 моў (Tagay et al., 2007; Hauffa et al., 2010).

## Указанні да карыстання

Анкета прызначана для дарослых ад 18 гадоў і можа быць прыменена да асоб самага позняга ўзросту. Умовай з'яўляецца ўменне чытаць і разуменне мовы. Анкета можа быць прыменена як да адной, так і да некалькіх асоб. Неабходна звяртаць увагу на тое, каб анкета была цалкам запоўненая. Час запаўнення анкеты складае ад 10 да 15 хвілін.

## Адзнака

Адносна пытанняў размеркавання пунктаў і сінтаксіса SPSS у дачыненні ЭТІ Вы можаце звяртацца да спадара Dr. Dipl. Psych. Sefik Tagay (sefik.tagay@uni-due.de): Tel.: 0201-9597021

## Літаратура: даследаванні адносна ЭТІ

Tagay S, Erim Y, Stoelk B, Möllering A, Mewes R, Senf W. Das Essener Trauma-Inventar (ETI) - Ein Screeninginstrument zur Identifikation traumatischer Ereignisse und posttraumatischer Störungen. Zeitschrift für Psychotraumatologie, Psychotherapie-wissenschaft, Psychologische Medizin 2007; 1: 75-89.

Hauffa R, Roth M, Biesold KH, Brähler E, Tagay S. Das Essener Trauma-Inventar. Validierung an einer Stichprobe von Bundeswehrsoldaten. Zeitschrift für Medizinische Psychologie 2010; 19: 81-87.